# Доўгае вяртанне Язэпа Пушчы

***Рэпрэсіі 1930-х гадоў прывялі да знікнення альбо вымушанага маўчання вялікай колькасці беларускіх літаратараў. Сярод іх адзін з заснавальнікаў літаратурных аб'яднанняў «Маладняк» і «Узвышша» – Язэп Пушча.***

У 1930 годзе ў Беларускім дзяржаўным выдавецтве павінна была выйсці кніжка вершаў Язэпа Пушчы «Сады вятроў», карэктуру якой ён атрымаў і прачытаў. Але ў друк яна не пайшла, больш за тое, рукапіс чакаў незайздросны лёс. Прыхаваны да лепшай пары ў старым вуллі, у час, калі ішло следства, ён быў спалены сваякамі – ад страху, што калі яго знойдуць, гэта можа мець дрэнныя наступствы для іх. Так знікла «выбранае» Язэпа Пушчы – лепшыя на думку аўтара творы, многія з якіх яшчэ нідзе не друкаваліся і былі назаўсёды страчаны.

У 1930 годзе, да свайго арышту 24 ліпеня, Язэп Пушча паспеў надрукаваць верш «Узмахі» («Полымя», № 2) і паэмы «Крывавы плакат», «Сады вятроў» («Узвышша», № 3). З той пары імя Язэпа Пушчы не траплялася на кніжных паліцах і старонках перыядычных выданняў БССР да 1956 года (у Заходняй Беларусі у 1935 і 1939 гадах яго творы публікавалі ў часопісе «Калоссе»).

Гэта не значыць, што Іосіф Паўлавіч не пісаў вершаў, час ад часу ён звяртаўся да паэтычнага слова. Складаныя перыпетыі лёсу знайшлі свой адбітак у такіх творах, як «На свеце боль і смутак ёсць», «Як я цябе люблю», «На этапе», «Суровы лёс», напісаных у Шадрынску Свярдлоўскай вобласці.

Як згадвала ў сваіх успамінах Станіслава Плашчынская, жонка паэта, у высылцы яго сустрэлі супрацоўнікі ГПУ з наступнымі інструкцыямі: *«На працягу пяцёх год адзін раз у месяц павінен з'яўляцца ў ГПУ, адзначацца. Працаваць у школе забараняецца. Вершаў не пісаць. Не выязджаць. Працаваць, калі знойдзеш работу, дазволена».*

Пісанне вершаў несла з сабой даволі вялікую рызыку, але сябры, з якімі ў яго была магчымасць тады ліставацца, у першую чаргу, Адам Бабарэка заахвочвалі Язэпа Пушчу не кідаць гэтай справы: *«Якая радасць, Язэп, чытаць тут, у краіне голаду і холаду для духа, ліст, што падобен цікаму праменю вясны ў цьме маўклівага выгнання. Твая лістоўка для мяне – гэта знак на тое, што саспелі ў душы тваёй "зёрны новых слоў", што прабіваюцца яны на свет, каб паўстаць у ім творамі вытанчанай паэзіі».*

Пасля высылкі Язэп Пушча разам з сям'ёй адпраўляецца ў Анапу, дзе піша вершы «Анапскія настроі», «Авідзій», «Адаму Міцкевічу», «Байрану».

Многія паплечнікі Язэпа Пушчы, адбыўшы тэрмін, спрабавалі вярнуцца на радзіму, але не ўсім пашчасціла так, як Максіму Лужаніну, многія былі арыштаваны паўторна і апынуліся ў яшчэ горшых умовах – у лагеры. Таму Іосіф Паўлавіч не спяшаецца ў Мінск, пераязджае з месца на месца, працуе бухгалтарам, а потым знаходзіць сабе месца настаўніка ў Манакоўскай сярэдняй школе і крыху пазней ў Чаадаеве, дзе сустрэне вайну і пражыве да 1958 года.

У Чаадаеве Язэп Пушча ўсё часцей звяртаецца да паэзіі, але ў адрозненне ад Андрэя Александровіча, Барыса Мікуліча ці Сяргея Грахоўскага не робіць спроб друкавацца. Больш за тое, стараецца не афішыраваць свайго мінулага, таму ў пасёлку нават не здагадваліся, што Іосіф Паўлавіч быў калісьці ў высылцы, а да таго быў вядомым беларускім паэтам.

Ва ўспамінах Васіля Хомчанкі, якому давялося служыць у Мурамскай (потым Уладзімірскай) вобласці, можна знайсці гісторыю пра іх знаёмства ў 1952 годзе. Праўда, дзеля справядлівасці варта адзначыць, што Васіль Хомчанка тады пазнаёміўся не з паэтам Язэпам Пушчам, а з дырэктарам мясцовай школы Іосіфам Плашчынскім.



*Язэп Пушча ў ссылцы. Шадрынск, 1931 г. (з фондаў БДАМЛіМ)*

Хомчанка быў актыўным удзельнікам Уладзімірскага літаратурнага аб'яднання, і яны разам з таварышам, рэдактарам абласной газеты «Прызыў» Яўгенам Асятровым, вырашылі наведаць настаўніка, які па чутках меў неблагія паэтычныя здольнасці. Але пад час сустрэчы Язэп Пушча вельмі перапалохаўся, што да яго прыехалі з праверкай органы, і паводзіў сябе вельмі замкнёна – не раскрыў сябе, патлумачыўшы, што толькі дапамагае вучням займацца паэтычнай творчасцю і абяцае зрабіць падборку.

Пасля, калі пісьменнікі наноў пазнаёмяцца ў Мінску, Язэп Пушча скажа Васілю Хомчанку, што ў 1952 годзе «час не наступіў для мяне, каб аб'явіцца». Гэты візіт вельмі ўсхваляваў паэта, узнікла жаданне раскрыць сваё творчае «альтэр эга», але ён устрымаўся і, як прызнаваўся потым, «лічыў, што зрабіў правільна». Пад час такіх перажыванняў і ўнутранага разладу Язэп Пушча спаліў частку твораў, напісаных у Чаадаеве. Больш-менш поўна позняя паэзія Іосіфа Паўлавіча прадстаўлена пачынаючы з 1955 года. Пра перагляд сваёй справы пісьменнік даведаўся ад Уладзіміра Дубоўкі: *«Братка, Язэп, я быў у Мінску ў Вярхоўным судзе, дзе атрымаў паперку аб рэабілітацыі. Я там бачыў і тваё прозвішча. Так што збірайся дахаты».*

У 1956 годзе Язэп Пушча зноў «аб'явіўся» ў беларускай літаратуры. Даслаў колькі сваіх вершаў у часопіс «Полымя». Як бачна з ліставання, першая спроба вярнуцца ў літаратуру поспеху не мела. Але 22 ліпеня ён дасылае яшчэ адзін ліст рэдактарам часопіса Максіму Танку і Анатолю Вялюгіну, якія адабралі да друку верш «Адаму Міцкевічу», напісаны яшчэ ў 1936 годзе ў Анапе. Яго апублікавалі ў № 10 часопіса за 1956 год. 26 доўгіх гадоў беларускія чытачы не мелі магчымасці знаёміцца з новымі творамі паэта, але далей імя Язэпа Пушчы ўжо не сыходзіць са старонак перыядычных выданняў.

З'яўляюцца думкі пра тое, каб пераехаць. Заклікаюць Іосіфа Паўлавіча вярнуцца і старыя знаёмцы-пісьменнікі: Станіслаў Шушкевіч і Алесь Якімовіч. У 1958 годзе Язэп Пушча разам з сям'ёй вяртаецца ў Мінск. У тым жа годзе Язэпа Пушчу і Дубоўку прымаюць у Саюз пісьменнікаў. Час плённай працы, магчымасць пажыць у доме творчасці «Каралішчавічы», родных мясцінах паэта. У 1960 годзе выходзіць кніга «Вершы і паэмы». Характэрна, што да першых пасля вяртання кніг Язэпа Пушчы і Дубоўкі прадмовы пісаў іх былы паплечнік Пятро Глебка. З агаворкамі, характэрнымі для таго часу, быццам, нельга было стала вярнуцца ў літаратуру наўпрост. Новая кніжка паэзіі Язэпа Пушчы затрымалася на 30 гадоў. У той жа час асобнымі выданнямі выходзяць казка «для малых і дарослых» «На Бабрыцы» і пераклад аповесці Аляксея Талстога «Дзяцінства Мікіты». А праз два гады яшчэ адна кніга паэзіі – «Пачатак легенды».

***Жыццё Язэпа Пушчы было сапраўды легендарным, на жаль, яно абарвалася ад цяжкай хваробы сэрца ў 1964 годзе. Доўгім і пакручастым было вяртанне яго ў беларускую літаратуру, але цяпер ён па праве займае пачэснае месца ў пантэоне найлепшых беларускіх паэтаў.***

Міхаіл БАРАНОЎСКІ



*Язэп Пушча ў другой палове 1950-х гг. (з фондаў БДАМЛіМ)*



*«Вершы і паэмы», 1960 г.*



*Рэдкалегія часопіса «Узвышша», 1927 г. (з фондаў БДАМЛіМ)*



*Дом, у якім жыў Язэп Пушча ў сяле Чаадаева (з фондаў БДАМЛіМ)*



*Літаратурнае аб'яднанне «Узвышша».*
*У першым шэрагу (злева на права):*
*Язэп Пушча, Адам Бабарэка, Уладзімір Дубоўка, Кузьма Чорны, Кандрат Крапіва.*
*У другім шэрагу:*
*Максім Лужанін, Сяргей Дарожны, Антон Адамовіч, Тодар Кляшторны, Змітрок Бядуля, Уладзімір Жылка, Васіль Шашалевіч, Пятро Глебка (фотаздымак 1928 г.)*




## На тым тыдні...

чаў культуры, мастацтва, навукі і г.д. Асноўныя раздзелы экспазіцыі пазнаёмяць наведвальнікаў з калекцыямі рукапісаў,

цы. Сучаснікі чулі вершы з вуснаў аўтара, некаторыя пакінулі пра гэта ўспаміны. Яхімоўшчына, дзе цяпер працуе філіял музея